# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
9 КРАСАВІКА
1992 ГОДА
№ 7(1673)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА


## ЧЫРВОНЫ РАДОК

*На філасофска-эканамічным факультэце да 30 чэрвеня будуць створаны новыя кафедры: міжнародных адносін; дзяржаўнага кіравання і палітычнай дзейнасці; сацыяльнай палітыкі,— а таксама лабараторыя вылічальнай тэхнікі на кафедры сацыялогіі.*

*Кафедра міжнародных адносін адкрыта таксама і на гістарычным факультэце нашага універсітэта.*

* * *

*Новы цэнтр нарадзіўся ва універсітэце — тэрміналагічны. Яго супрацоўнікі будуць займацца каардынацыяй працы над стварэннем і ўпарадкаваннем беларускай навуковай тэрміналогіі ў межах навучальных дысцыплін, якія выкладаюцца ва універсітэце. Старшынёй новага падраздзялення прызначаны прафесар Леў Міхайлавіч Шакун.*

* * *

*Шэраг перайменаванняў напаткаў некалькі кафедраў гістарычнага і геаграфічнага факультэтаў у адпаведнасці з рашэннем Вучонага савета універсітэта. Кафедра расійскай гісторыі будзе называцца цяпер кафедрай расійскай і славянскай гісторыі з найстаражытнейшых часоў да пачатку XX стагоддзя. Кафедра гісторыі СССР — кафедрай найноўшай гісторыі славянскіх краін. Кафедра фізічнай геаграфіі СССР перайменавана ў кафедру фізічнай геаграфіі і аховы прыроды, а кафедра эканамічнай геаграфіі СССР — у кафедру эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці.*

* * *

*У пачатку бягучага года пры БДУ працавала 41 малое прадпрыемства, навукова-тэхнічны кааператыў, таварыствы з абмежаванай адказнасцю і іншыя падраздзяленні, якія займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю. Аб'ём работ, выкананых імі, склаў 19,9 мільёна рублёў. Універсітэту пералічана 118,1 тысячы рублёў.*

## ПРЭС-АПЫТАННЕ

# РЭФЕРЭНДУМ! РЭФЕРЭНДУМ?

Калі ў апазіцыі ў парламенце атрымаецца сабраць да 12 красавіка 350 тысяч подпісаў прыхільнікаў рэферэндума па ўсёй рэспубліцы (а сабрана, дарэчы, ужо больш за 320 тысяч), то паўстае пытанне аб усенародным рашэнні наконт новых выбараў Вярхоўнага Савета Беларусі яшчэ да сесіі ў кастрычніку гэтага года. Ці хвалюе гэта нас: супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта?



**Васіль Пятровіч, ВАРАБ'ЕЎ, загадчык кафедры:**

— Працэсы, якія адбываюцца зараз, прымушаюць людзей задумацца: што дасць нам рэферэндум? Многія выказваюць свой недавер цяперашняму парламенту. Але ці пад час сама выбарная кампанія? І якім чынам яе весці? Гэта ўсё ж адцягне вырашэнне ў хуткім часе многіх складаных праблем.

Здаецца, наш Вярхоўны Савет здольны правесці самарэфармаванне, і, на мой погляд, пакуль гэта выйсце.

**Вячаслаў, студэнт V курса факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі:**

— Калі шчыра: мяне гэта амаль не цікавіць. У мяне іншыя праблемы: дыплом, размеркаванне...

**Генадзь ПАЦЕКІН, намеснік старшыні прафкома студэнтаў:**

— А я лічу: усё, што ні робіцца,— да лепшага. Яшчэ не падпісаўся ў падтрымку рэферэндума, але ў хуткім часе пастаўлю свой подпіс.

**Сяргей МЯСНІКОЎ, студэнт II курса гістарычнага факультэта:**

— А якая карысць? Марна ўсё гэта. Раней трэба было рабіць, а зараз — позна.

**Іван РАК, каардынатар міжнародных праграм Цэнтра маладзёжных ініцыятыў:**

— Я супраць рэферэндума. І лічу, што ён бессэнсоўны. Наш цяперашні парламент больш-менш уладкаваны (набылі ўжо тое-сёе неабходнае для жыцця, маецца на ўвазе, халадзільнікі, тэлевізары, кватэры і г.д.). Зразумела, новыя людзі, якія прыйдуць да ўлады, у большасці сваёй будуць імкнуцца стварыць для сябе добрыя ўмовы. І гэта натуральна. А час ідзе. Навошта яго губляць?

**Юрый ЕЎТУШЭНКА, студэнт V курса гістарычнага факультэта:**

— Я не цікаўлюся сур'ёзна ні ўнутранай, ні знешняй палітыкай. І лічу, што грамадства павінна развівацца па сваіх асаблівых законах. Барацьба за ўладу — гэта натуральна, і яна заўсёды будзе існаваць.

Меркаванні збірала
Т. КАЗАК.

## ДОШКА АБ'ЯЎ

Савет маладых навукоўцаў Белдзяржуніверсітэта аб'яўляе конкурс на лепшы праект навуковай распрацоўкі сярод калектываў маладых навукоўцаў, які будзе фінансавацца ў 1993 годзе.

З правіламі афармлення заявак на ўдзел у конкурсе можна пазнаёміцца ў старшынь Саветаў маладых навукоўцаў факультэтаў.

Заяўкі трэба падаваць Мікалаю Калевічу (пакой 134 галоўнага корпуса). Апошні тэрмін падачы — 30 красавіка 1992 года.

* * *

У мэтах падтрымкі і стымулявання таленавітай моладзі ва ўсіх галінах дзейнасці Савецкі фонд міру, Гуманітарны фонд «Веды», цэнтр «Філантропія» праводзяць дабрачынную праграму «Маладыя таленты».

У межах праграмы праводзяцца конкурсы па раздзелах:
хімічная экалогія;
юрыспрудэнцыя;
інфарматыка;
укараненне сучаснай медыцынскай тэхнікі;
тэхналогія захавання сельскагаспадарчай прадукцыі;
псіхалогія;
літаратурны конкурс.

Для пераможцаў у кожным раздзеле прадугледжваюцца прэміі ў памеры 15 тысяч рублёў.

У конкурсе могуць прыняць удзел аўтары, не старэйшыя за 30 гадоў.

Падрабязную інфармацыю аб умовах конкурсу можна атрымаць у Савеце маладых навукоўцаў універсітэта (пакой 134 галоўнага корпуса, тэл. 96-11-80, А. М. Малярэвіч) або ў старшынь Саветаў маладых навукоўцаў факультэтаў.

Прапануем творчым асобам універсітэта прыняць актыўны ўдзел у конкурсе.

Тэрмін падачы работ да 1 ліпеня 1992 года.

## РАТУЙЦЕ!

# ЗЛАДЗЮЖКУ СТВАРАЕ МАГЧЫМАСЦЬ УКРАСЦІ

Жарт апошняга часу: сумленне злодзея — за рысай беднасці. Здаецца, сумленне і сапраўды папала ў шматлікі шэраг дэфіцытаў, і адчуваем мы гэта на кожным кроку. На сваіх працоўных месцах таксама.

Белдзяржуніверсітэт разам з педагагічным інстытутам — сярод тых устаноў Маскоўскага раёна, дзе склалася неблаганадзейнае становішча з захаваннем дзяржаўнай і асабістай маёмасці. У першым квартале бягучага года ў МДПІ адбылося пяць крадзяжоў асабістых рэчаў выкладчыкаў і студэнтаў. Так, 31 студзеня з аўдыторыі № 43 была ўкрадзена футра, а праз некалькі гадзін з той жа аўдыторыі — сумачка з дакументамі і грашыма. 4 сакавіка з пакоя № 105 кафедры хіміі, куды быў свабодны доступ для ўсіх жадаючых, украдзены грошы і купоны.

Тры крадзяжы адбыліся ў лютым у БДУ. З бібліятэкі знікла сумачка з грашыма, у геаграфічным корпусе ўкрадзены дакументы і грошы. І гэта не поўны пералік.

Часцей за ўсё крадзяжы адбываюцца з-за халатных адносін да маёмасці. Злодзея стварае магчымасць украсці — так лічыў знакаміты філосаф Ф. Бэкон.

**М. СТАРЖЫНСКІ,**
супрацоўнік Маскоўскага РАУС.

## З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# МЕДЫУМ... НІЯКІ

Свой медыум трэцякурснікі журфака адзначылі 26 сакавіка ў кафэ «Час» ДК трактарнага завода. Вечарына складалася з выступленняў аматарскай гурпы «Б.Б.» (варыянты перакладаў: «Бэбі, Блюз», «Беларуская Банда» — каму як падабаецца) і танцавальнага ансамбля, а на ўвесь астатні час — дыскатэкі. Гоман і шум не змаўкалі ўвесь вечар, перакрывала іх толькі музыка, таму калі дэкан факультэта звяртаўся да студэнтаў з добразычлівай прамовай, не ўсё можна было дачуць.

Медыум быў журналісцкі, таму і нумары святочнай праграмы былі прасякнуты спецыфікай будучай працы. Напрыклад, рабілася пародыя на тэлеперадачу «Каханне з першага позірку», а ў тых, хто выклікаўся на сцэну, браліся жартаўлівыя інтэрв'ю.

А адзінаццатай гадзіне, калі скончылася дыскатэка, паветра для тых, хто танцаваў, ужо не хапала, а вентылятары не працавалі...

Нельга сказаць, што медыум атрымаўся дрэнным. Выдатным цяжка яго назваць таксама. Ён быў проста... ніякі. Пэўна, кожнае дзесяцігоддзе мае свой эталон свята. Калі глядзець на наш медыум як на тыповае свята 90-х, можна знайсці ў ім характэрныя для нашага жыцця рысы: меркантыльны падыход да ўсяго, нават да чалавечых зносін, засяроджанасць кожнага на сабе... Але свята медыуму для сённяшніх трэцякурснікаў больш не паўтарыцца. І мы запомнім яго такім, якім ён атрымаўся.

**Ягор КОНЕЎ,**
студэнт факультэта журналістыкі.

# СТАЛОВАЯ ЧАКАЕ

Магчыма, з 1 мая ва універсітэце з'явіцца новае падраздзяленне з назвай «Сталовая Белдзяржуніверсітэта». Яно аб'ядное сталовыя і буфеты, якія дасюль абслугоўвалі БДУ, але належылі трэстам сталовых Маскоўскага, Кастрычніцкага, Цэнтральнага і Партызанскага раёнаў. Цяпер гэтыя трэсты, як і іншыя, перапыняюць сваё існаванне — у адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. А частка падраздзяленняў, якія былі ў іх складзе, могуць аб'яднацца як адно самастойнае прадпрыемства гандлю і грамадскага харчавання

Дырэктарам «Сталовай Белдзяржуніверсітэта» прызначана Галіна Раманаўна ПЛЮХІНА, сённяшні дырэктар сталовай № 33.

Але ў адказ на віншаванні рэдакцыі з новай пасадай Галіна Раманаўна збянтэжыла:

**— Віншаваць мяне пакуль няма з чым. Яшчэ нічога не вырашана канчаткова. Мы чакаем рэкамендацый Міністэрства адукацыі наконт сталовых навучальных устаноў. У сувязі з ліквідацыяй трэстаў гэтыя сталовыя аказаліся ў незразумелым становішчы. Пакуль невядома, ці будзе ў іх магчымасць застацца самымі таннымі (нацэнка тут — 30 працэнтаў, у іншых сталовых — 50) — ці будуць яны дастаткова фінансавацца ва ўмовах цэн, якія бесперапынна і жудасна растуць. А хіба ж пойдуць да нас студэнты, калі падаражае наша прадукцыя?**

## А Ў НАС — НАВАСЕЛЛЕ!

# МОЖНА ПАЧЫНАЦЬ СПАЧАТКУ

Даўно наш універсітэт не перажываў такой колькасці пераездаў і наваселляў. Асобныя службы, лабараторыі, аддзелы і цэлыя факультэты збіралі сваю маёмасць і перавозілі ў новыя пакоі. І сапраўды — на новым месцы ёсць магчымасць аднаўляцца, пачынаць усё спачатку. Нават калі новае месцазнаходжанне зусім нядаўна належыла Вышэйшай партыйнай школе, якая зусім не ў пашане сёння. Між тым, можна і забыцца на гэта. Цяпер гэты будынак па вуліцы К. Маркса, 31 стаў вучэбным корпусам універсітэта. Навасёлы тут — філалагічны і філасофска-эканамічны факультэты, дэканат па рабоце з замежнымі студэнтамі, бібліятэка.

Але пераезды напаткалі не толькі іх і не толькі ў сувязі з перадачай БДУ корпуса былой партшколы. Дачакаўся пачатку капітальнага рамонту будынак старога фізічнага корпуса. У сувязі з гэтым прыйшлося пераразмеркаваць многія вытворчыя плошчы ва універсітэце: у галоўным корпусе і на геаграфічным і хімічным факультэтах, у інтэрнаце па вуліцы Крапоткіна, 51 і ў клубе «Гаудэамус», у будынках па вуліцы Бабруйская, 7 і 9, а таксама па вуліцы Захарава, 59.

Пераезды пакуль скончыліся, і на новых месцах пачалася праца і вучба. Новая?

## САКРЭТ ФІРМЫ

# ЯКОГА РЭКТАРА ЗАСЛУЖЫЛІ...

23 сакавіка адбыліся выбары новага рэктара Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта. Яны пацвердзілі прагнозы песімістаў наконт таго, што імя рэктара вядома загадзя, а рэгістрацыя астатніх чатырох прэтэндэнтаў — фармальнасць. Уся перадвыбарная кампанія працягвалася толькі два тыдні, а права ўдзельнічаць у галасаванні атрымалі толькі члены факультэцкіх вучоных саветаў.

Двое кандыдатаў, якія лічацца дэмакратычна думаючымі, у другі тур выбараў не прайшлі — гэта акадэмік ВАСХНИЛ А. Емяльянаў і член-карэспандэнт РАН В. Лунін.

Выступленне міністра навукі, вышэйшай школы і тэхнічнай палітыкі Расійскай Федэрацыі Б. Салтыкова было перапынена залай.

Вынікі такія: рэктарам МДУ стаў былы яго першы прарэктар В. Садаўнічы, які набраў у другім туры 58,3 працэнта галасоў.

# СА СВАІМ СТАТУТАМ

ВНУ Казахстана цяпер будуць самі вызначаць правілы прыёму, парадак, колькасць і формы экзаменацыйных іспытаў. Такое рашэнне прынята Міністэрствам адукацыі рэспублікі. Само міністэрства будзе толькі ажыццяўляць кантроль за выкананнем законаў і нарматыўных актаў. Да канца гэтага навучальнага года кіраўнікі ВНУ павінны выпрацаваць пэўныя агульныя палажэнні і пры гэтым не дапусціць «зніжэння адукацыйных стандартаў і патрабаванняў да ведаў абітурыентаў».

*(Працяг на 2-й стар.).*

ПАЛІТЫЧНЫ РЫНГ

# ЗЯНОН — БАЦЬКА АНАРХІІ

**Уладу і дзяржаву анархісты не прымаюць прынцыпова, і гэта, як яны кажуць, ідзе аж ад Зянона, старажытнагрэчаскага філосафа.**

Мінская група анархістаў колькасцю ўсяго каля 15 чалавек створана на аснове панк-культуры. Яны лічаць сябе свабоднай арганізацыяй, прынцыпова не рэгіструюцца — гэта для іх не так неабходна.

Таму атрымліваецца, што фармальна анархістаў у нас як бы і няма, а на самой справе — ёсць.

У большасці сваёй мінскія анархісты не падтрымліваюць КАС (Канфедэрацыю анарха-сіндыкалістаў), адну з самых вялікіх арганізацый анархістаў (каля 1000 чалавек), створаную ў 1989 годзе ў Маскве. І, напэўна, таму, што спачатку гэта быў палітычны клуб «Община» пры Маскоўскім пэдінстытуце, куды ўвайшлі ў асноўным камсамольцы-актывісты. А камсамольцы — вядома, не сапраўдныя панкі, хоць і анархісты.

Ёсць мноства адгалінаванняў у рамках анархізму: ад анархістаў-пацыфістаў, з ухілам у рэлігійную этыку, да анархістаў-камуністаў, якія, у адрозненні ад іншых анархістаў, не адмаўляюць магчымасць тэрору як «неабходнай абароны».

Але ўсе анархісты ў аснову сваіх праграмных дакументаў паставілі вучэнне аб будаўніцтве бездзяржаўнага грамадства М. А. Бакуніна.

Тое, што абсалютнай свабоды не існуе, анархісты добра ўсведамляюць. Таму для іх свабода — абавязкова не ў шкоду другой свабоднай асобе. А быць асабіста свабодным — гэта значыць мець магчымасць максімальнай рэалізацыі сваіх здольнасцяў, мець права, па словах Бакуніна, «не паступацца ні думкаю, ні воляй перад якой бы то ні было ўладай, акрамя асабістага розуму і асабістага сумлення».

На што ж яны спадзяюцца, калі лічаць дэвізам свядомае адмаўленне ад дзеянняў, якія вядуць да ўзяцця ўлады? Яны не імкнуцца навязаць свае ідэі шырокім масам. Навошта? Галоўнае — уздзейнічаць на канкрэтнага чалавека, проста растлумачыць яму, што такое свабода і чаму ён не свабодны.

Ідэя анархізму яшчэ не завалодала масамі, і гэта, дарэчы, пацвярджаецца: анархістаў не шмат, сувязі паміж рознымі суполкамі амаль адсутнічаюць (таму што анархісты прынцыпова не ствараюць сваіх органаў улады).

Але яны змагаюцца — лістоўкі, мітынгі, акцыі пратэсту. Двайцаць восемае сакавіка было днём сумесных дзеянняў пратэсту анархістаў усяго свету. Мінскія анархісты ў гэты дзень збіралі подпісы ў абарону сваіх паплечнікаў, якія былі арштаваны ў Маскве на адным з мітынгаў.

Нават выпускаюць сваю газету. Калі вам яна калі-небудзь трапіць у рукі, не здзіўляйцеся вялікай колькасці «моцных» выразаў. Але анархісты не лічаць гэта прыкметай непрыстойнасці і нятэрпімасці — кожны павінен выказваць свае думкі, як можа і як жадае. Усё залежыць ад узроўню культуры кожнага чалавека і ад яго комплексаў.

Яны ўпэўнены, што анархія — гэта не хаос, і імкнуцца жыць проста і свабодна.

Т. КАЗАК.

# ЧЫРВОНЫ СЦЯГ ПАД АХОВАЙ МІЛІЦЫІ



**Мінская плошча Незалежнасці днямі стала сведкай выяўлення новага вітка напружанасці, якая ахоплівае сёння наша грамадства. Планаваўся мітынг, і людзі прыйшлі на яго з рознымі сцягамі і, натуральна, пераканаццямі. Для некаторых нашых грамадзян гэтага дастаткова, каб схапіць суайчынніка за каўнер. Вось і прыйшлося моцным хлопцам з міліцыі браць пад ахову купку людзей з чырвонымі сцягамі ў руках. Выказвацца ля мікрафона прыхільнікі камуністычнага шляху развіцця не імкнуліся, таму прарываў міліцэйскага ланцугу не назіралася.**

**Скручваючы сцягі, бакі разышліся. Да наступнага разу.**

Фота С. ГРЫЦА.

# «НАМ РАНА ЖЫЦЬ УСПАМІНАМІ...»

**Прачнуўшыся 8 снежня 1991 года, беларускі камсамолец і ў сталіцы, і ў далёкай глыбінцы пачуў па радыё, што ён, між іншым, ужо не камсамолец.**

Атрымалася, што XXX з'езд ЛКСМБ, які адбыўся напярэдадні (6—7 снежня) у ММЦ «Юнацтва», «выказваючы настрой большасці дэлегатаў», трансфармаваў камсамол рэспублікі ў іншую, непалітычную, дэідэалізаваную арганізацыю — СМБ, накіраваную на абарону сацыяльна значных інтарэсаў беларускай моладзі. Аднак група дэлегатаў-камсамольцаў заявіла аб сваім імкненні аднавіць дзейнасць ЛКСМБ.

Такая перадгісторыя XXXI з'езда ЛКСМБ, які адбыўся 1-2 лютага пад Пінскам.

З'езд прыняў Статут і Праграмную заяву ЛКСМБ, Пастанову «Аб аднаўленні арганізацыйных структур і дзейнасці ЛКСМБ», а таксама шэраг рэзалюцый і абраў кіруючыя органы ЛКСМБ.

Такім чынам, ЛКСМБ пасля кароткага перапынку зноў выйшаў на арэну грамадска-палітычнай дзейнасці як маладзёжная камуністычная арганізацыя Рэспублікі Беларусь. Адраджаючы ЛКСМБ, мы імкнемся стварыць ачышчаную ад заганаў і скажэнняў застойных гадоў арганізацыю маладых людзей.

Мы хочам, каб плячо ў плячо сталі тыя, хто задаў сабе пытанне «Што ж будзе далей?» і, атрымаўшы змрочны адказ, не хапаецца за выратавальную думку: «Ну, а што я магу зрабіць? Ды й наогул, мяне павінна пранесці». Каб тыя, у каго ў душы нараджаецца падсвядомы пратэст, калі яны назіраюць тое, што адбываецца; тыя, хто разумее, што сёння лёс кожнага залежыць ад таго, як пойдуць справы ў краіне; тыя, хто хоча змагацца, а не плысці па цячэнню,— з'ядналіся ў моцным саюзе пад сцягам ЛКСМБ. Мы ж грамадска-палітычная арганізацыя, якая здольна ў будучым (гэта будзе залежыць ад яе сілы) уплываць на прыняцце рашэнняў на самых высокіх узроўнях, змагацца і ўдзельнічаць у прыняцці такіх рашэнняў, якія б адлюстроўвалі інтарэсы моладзі — працоўных і навучэнцаў.

Наша мэта не абарона інтарэсаў (абараняюць, як правіла, слабага ад моцнага), а выражэнне інтарэсаў моладзі, магчымасць , для маладых самім фармуляваць і з пачуццём годнасці адстойваць свае інтарэсы, змагацца за сваё будучае, за будучае сваёй краіны.

Як ЛКСМБ бачыць гэту будучыню?

Мы супраць таго, каб жыць у краіне, якая ў сусветным раздзяленні працы зойме месца ў асноўным сыравіннай дзяржавы. Мы за тое, каб краіна ішла не назад да капіталізму XIX стагоддзя, а наперад — да грамадства, слабыя прыкметы якога ўжо прагледжваюцца ў найбольш развітых краінах, перш за ўсё ў Японіі. І не важна, як назваць гэта будучае грамадства: постіндустрыяльным, інфармацыйным ці камунізмам. Мы называем яго Камунізмам, паважаючы тыя мільёны, якія аддавалі свае сілы, сваё жыццё, хто пераживаў незвычайныя пакуты, але нават у засценках сталінскіх лагераў не адмаўляліся ад сваіх перакананняў, верылі, што больш гуманнае, больш перадавое грамадства магчыма, хто ў сілу сваіх глыбокіх ведаў і інтэлектуальных магчымасцяў ведаў, што гэта не утопія, а аб'ектыўны ход гісторыі чалавечага грамадства, якое, як і ўсё жывое ў гэтым свеце, развіваецца. І гэтыя веды станавіліся асновай веры, асновай перакананняў, якія не маглі пахіснуць самыя цяжкія страты, а не тое што подых ветру палітычнай кан'юнктуры, які дае радасную магчымасць мімікрываваць.




Нас пакуль мала. Але мы ведаем і верым, што нашы імкненні, нашы магчымасці і нашы справы стануць справай неабыякавай, здольнай дужаць моладзі.

Зараз па ўсёй рэспубліцы ідзе фарміраванне тэрытарыяльных камсамольскіх арганізацый. Першай была створана Мінская гарадская арганізацыя ЛКСМБ, устаноўчы сход якой адбыўся 29 лютага 1992 года. У дзень стварэння ў Мінску камсамольскай арганізацыі на ўлік стала некалькі дзесяткаў чалавек. Сёння колькасць гарадской арганізацыі вырасла за кошт рабочых прадпрыемстваў, выкладчыкаў, навучэнцаў.

Акрамя Мінскай, у рэспубліцы створаны і дзейнічаюць Пінская і Быхаўская гарадскія арганізацыі ЛКСМБ.

Аб парадку пацверджання членства і ўступлення ў Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі Беларусі звяртацца па кантактным тэлефоне ў Мінску: 25-44-72 (у суботу з 10 да 15 гадзін).

С. КАМАРОЎ,
член ЦК ЛКСМБ, сакратар Мінскай гарадской арганізацыі ЛКСМБ.

СЛУЖБА 03

# ПЕРАНАЧУЕМ — БОЛЕЙ ПАЧУЕМ

Актыўнае жыццё чалавека перыядычна перапыняецца фазай спакою — сном, што забяспечвае фізічнае і псіхічнае здароўе.

З дапамогай электраэнцэфаляграмы (рэгістрацыі біяэлектрычнай актыўнасці галаўнога мозгу) даказана, што ў час сну пастянна змяняецца яго глыбіня. Адрозніваюць уласна сон і сон са снамі, якія не могуць замяніць адзін аднаго. Пасля стадыі стомленасці ідзе засынанне, якое пераходзіць у лёгкі сон. Затым надыходзіць стадыя сну сярэдняй глыбіні, якая заканчваецца глыбокім сном. Пасля чаго ідзе сон са снамі. Такія этапы паўтараюцца ад 3 да 5 разоў за ноч, з кожным наступным паўтарэннем час уласна сну змяншаецца, а сны павялічваюцца. Як ні парадаксальна, але арганізм максімальна адпачывае не ў стадыі глыбокага сну, а ў час сноў. Напэўна, сны вызваляюць арганізм ад «псіхалагічных канфліктаў дня».

«Сны,— гаварыў З. Фрэйд,— гэта выражэнне як самай узвышанай, так і самай нізкай дзейнасці нашай душы».

Сон неабходны людзям. Ён з'яўляецца сродкам абароны арганізма ад перастамлення. Падобна таму, як голад выклікае патрэбу ў ежы, так стомленасць выклікае сон. Чалавек можа жыць без ежы да трох тыдняў. Але тры тыдні без сну прывялі б да складанейшых псіхічных і фізічных расстройстваў.

Норма сну для дарослага чалавека — 8 гадзін. Аднак у залежнасці ад індывідуальных асаблівасцей, узросту, нагрузак, яна зазнаваць вагаецца. Але можна сказаць пэўна: чалавек павінен спаць не менш чым 5 гадзін у суткі.

У гістарычнай і сучаснай літаратуры сустракаюцца імёны вядомых людзей, сон якіх адрозніваўся малой працягласцю. Гэта Напалеон, Віхроў, Мірабо, Шылер і шэраг іншых. Ім было дастаткова ад некалькіх хвілін да некалькіх гадзін сну ў суткі, каб аднавіць свае сілы. Амерыканскі вынаходнік Томас А. Эдысон вымушаны быў на працягу года спаць толькі па дзве гадзіны ў суткі і, як ён сам казаў, ніколі не выкарыстоўваў больш чым 4—5 гадзін сну. А такія славутыя асобы як Шапенгаўэр, Гётэ, У. Чэрчыль спалі значна даўжэй. Гётэ, напрыклад, мог праспаць 24 гадзіны запар.

Калі аналізуюцца крывыя работы мозгу і функцыі вегетатыўнай нервовай сістэмы, выходзіць, што той, хто «пакутуе ад бяссонніцы», спіць не намнога менш, чым абсалютна здаровы чалавек.

Якія ж прычыны, што перашкаджаюць чалавеку спаць здаровым сном? Іх вельмі многа. Расслабленню арганізма перашкаджае эмацыянальнае напружанне. Гнеў, злосць, асцярога, віна, жах, сорам, раскаянне ці прыгнёт ад нейкіх жыццёвых няўдач часцяком пазбаўляюць чалавека сну. Як толькі праблема, ад якой пакутвала псіхіка чалавека, вырашаецца, бяссонніца адразу ж адыходзіць. Думка «я не засну» вельмі шкодная для здаровага сну.

Даследуючы прычыны доўгага незасынання ўвечары, вучоныя прыйшлі да вываду, што галоўная з іх — уператамленні арганізма. Парушэнне сну можа быць выклікана работай у розныя змены з частам адпачынку, які чаргуецца нерэгулярна. Перазданне ці прыём тлустай ежы таксама садзейнічае расстройству сну. Недарма народная мудрасць сцвярджае: «не лажыся сытым, устанеш здаровым». Кава, нікацін перад сном не на карысць яму.

Пастаяннае ўжыванне стымулятараў, а таксама прыём алкагольных напіткаў «для лячэння дурнога настрою» прыводзяць да значных парушэнняў сну. Небяспека іх у тым, што з часам устанаўліваецца залежнасць сну ад гэтых сродкаў. Цяжкія хранічныя расстройствы сну ў многіх выпадках прыводзяць да таго, што людзі выкарыстоўваюць неапраўдана працяглае лячэнне снатворнымі сродкамі. Паступова гэтыя прэпараты страчваюць сваю эфектыўнасць — становіцца неабходным павелічэнне дазіроўкі. Працяглае ўжыванне снатворных можа само правакаваць расстройства сну.

Важнае правіла здаровага сну заключаецца ў тым, што класціся ў ложак трэба толькі тады, калі папраўднаму адчуеш стомленасць, як фізічную, так і псіхічную. Тады засынаеш хутка. Прыказка пацвярджае гэта: «ад бяссонніцы працай лечацца».

А. КРАСНІКАВА.

АСТРАЛАГІЧНЫЯ

ЖАРЦІКІ

# «ВОДБЛІСК» САМ ПРА СЯБЕ

«Водбліск» нарадзіўся 14 лістапада, пад знакам Скарпіёна, хаця, адзначу адразу, гэта можа не мець ніякіх вынікаў. Калі раптам у структурнай карце яго гараскопа высветліцца ўплыў Льва, то «Водбліск» праявіць сябе як леў, а Скарпіёнам будзе фармальна. Але гэта тонкасць для «літараеда».

Якія перспектывы можна прадбачыць, зыходзячы з даты нараджэння «Водбліска»?

### КАМЕНТАРЫЙ АСТРОЛАГА.

— Скарпіён — лепшы з крытыкаў (пасля Дзевы), не верыць на слова. Яму лепш ва ўсім пераканацца асабіста... Беражыцеся, падманныя куміры: той, хто бязлітасны да сябе (выганяючы зло), не пашкадуе і іншых, чые пер'і рыпяць хлуснёй. Хай зззяе Ісціна.

Насцярожаны, забярэцца наш Скарпіён у стосы прац па філасофіі і адразу пакусае і выплюне тых, хто асмеліўся сябе ўзвысіць. Ваяўнічы дух, які праз гром і смерць прайшоў, ён ведае сапраўдныя каштоўнасці і вам дапаможа знайсці іх...

Што «Водбліску» можна параіць? Зразумела, капаць углыб, паблісквaючы вясёлым скарпіёнавым вокам, якое называюць магічным, дахадзіць да сутнасці, не пужаючы непадрыхтаваных лавінай тэрмінаў. Хай будзе філасофія побач з жыццём. Яму можна нават мець уласны погляд на ўсю філасофію, разам узятую. Але прыхавана. Бо кідацца ў палеміку ў год Малпы — гэта рызыка. Лепш падарожнічаць, хаця б інтэлектуальна. Прыгоды і знаходкі сёлета гарантуюцца.

Цяпер пра структурную карту. Гэта нічога, што такі вэрхал ліній. Затое можна вывучыць да скону (каб урэшце канчаткова заблытацца). А раптам астралогія — гэта толькі ўступ? Да жыцця (нават калі яно штодзённае)? Раптам гэта нейкая мазгавая размінка? Аднак — давайце — кожны вырашае для сябе. А «Водбліск», зразумела, не абмяжуецца рамкамі свайго гараскопа, бо нават у Старажытным (вельмі!) Егіпце жрэцтва ведала: знак нараджэння — гэта толькі стартавая кропка эвалюцыі.



*«Дух чань падобны на смак гарбаты»,— казаў Бодхідхарма, заснавальнік чань-будызму ў Кітаі. Ён прыўнёс у культуру Кітая гэты «антырытуал», які ўзнёс бытавы акт піцця гарбаты да спосабу спасціжэння Вечнасці, Ісціны, Таямніцы. І хаця «слова — гэта толькі прах дзэн», нам не пашкодзіць паслухаць Какудзу Акакуру (Японія): «Іншаземны абывацель бачыць у цырымоніі гарбаты толькі яшчэ адзін прыклад тысячы і аднаго дзівацтва... Перш чым смяяцца над гэтым абрадам варта падумаць, якія па сутнасці малы кубак чалавечых радасцяў і наколькі мудрыя тыя, хто ўмеюць яго запоўніць. Цырымонія гарбаты для японцаў — гэта рэлігія. Гэта абагаўленне мастацтва жыць».*

ЯПОНСКАЯ НАВУКА ЖЫЦЬ

# ЗАПАВЕТ БОДХІДХАРМЫ



Усевалад Аўчыннікаў у кнізе «Сакура і дуб» таксама разважае пра гэту цырымонію: «Гэты абрад — ключ да разумення нацыянальнай псіхалогіі, не менш важны, чым бусідо, — маральны кодэкс самурая, пра які на Захадзе шмат пісалі.

Выраз «Ён умее жыць» японцы разумеюць па-свойму. У іх уяўленні чалавек, які ўмее жыць, бачыць радасці жыцця там, дзе іншыя праходзяць, не зважаючы. Цырымонія піцця гарбаты вучыць знаходзіць цудоўнае ў штодзённасці. Гэта з'ядnanне мастацтва з буднямі жыцця.

Калі страсці, што бушуюць у чалавечай душы, нараджаюць пэўныя жэсты, то — як лічыць майстар гэтай цырымоніі — ёсць і такія жэсты, якія здольны ўздзейнічаць на душу, супакойваючы. Строга вызначанымі рухамі, іх прыгажосцю і мернасцю цырымонія піцця гарбаты стварае спакой душы, прыводзіць яе ў той стан, пры якім яна асабліва чуйна адгукаецца на ўсепранікаючую прыгажосць прыроды.

У цырымоніі прымаюць удзел не больш за пяць чалавек. Нават калі на дворы дзень, у пакоі павінен стаяць паўзмрок. На кожным прадмеце ляжыць адбітак часу. Ёсць толькі два выключэнні — беласнежная ільняная хусцінка і коўш, зроблены са спілаванага кавалка бамбука, якія бываюць падкрэслена свежымі і новымі.

Пакой для цырымоніі афармляецца з вытанчанай прастатой, што ўвасабляе ў сабе класічнае японскае ўяўленне аб прыгожым. Гэта падкрэсленая прастата ці нават беднасць іншы раз вельмі дорага абыходзяцца гаспадару, таму што якое-небудзь карчакаватае бервяно можа быць зроблена з вельмі рэдкай пароды дрэва і, да таго ж, мець асаблівую цану з-за сваіх мастацкіх вартасцяў.

Не толькі большасць японскіх жанчын, але і многія мужчыны дагэтуль вывучаюць кожны рух цырымоніі. Яе ўплыў адчуваецца ў многіх галінах японскай культуры. Менавіта адсюль бяруць пачатак такія паняцці японскай эстэтыкі, як «вабі», «сабі», «сібуй». Цырымонія гарбаты нарадзіла мастацтва ікебана. Японская кераміка ніколі не дасягнула б такіх вяршынь, калі б не гэты рытуал, які аказвае глыбокі ўплыў і на паводзіны японцаў.

Мост паміж мастацтвам і прыродай, а таксама мост паміж мастацтвам і штодзённым жыццём — зыходзячыя характарыстыкі японскай культуры. У гэтай краіне ніколі не існавала падзелу мастацтва на чыстае і прыкладное. Японцы прывыклі атаясамліваць прыгожае з мэтазгодным, і кожны прадмет у іх жытле яднае ў сабе прыгажосць і практычнасць...»

Безумоўна, вопыт японцаў прыдатны да жыцця, калі вам хочацца яго змяніць. А размову пра Японію, яе эстэтыку і культуру можна прадоўжыць у наступных выпусках.

# КАНЦЭПЦЫЯ ЦІШЫНІ



Перадача Ісціны праз абсурд — гэта толькі адзін са спосабаў выкладання дзэн. Гэта старажытная філасофская сістэма, як водгалас мінуўшчыны, у XIX стагоддзі ідэйна паланіла Захад (ёй захапляліся Ван Гог, Дэга, Сэлінджэр, Драйзер і інш.).

Будызм, прынесены ў Кітай у V стагоддзі, трансфармаваўся там у сістэму чань, а адтуль трапіў у Японію, дзе вядомы як «дзэн». Словы «дзэн», «чань» паходзяць ад санскрыцкага «дх'яна» — так называецца метад вызвалення ад мітусні розуму. Па-другому дх'яна — гэта медытацыя без думак, сузіранне.

Дзэн загадкавы як канцэпцыя (яго заўсёды выкладаюць настаўнікі, майстры; шлях дзэн — «ад сэрца да сэрца») і немудрагелісты на практыцы. «Тое, што можа быць дасягнута, можа быць дасягнута зараз». Дзэн на Усходзе прысутнічае ў жыцці гараджан і за сценамі манастыроў, у архітэктуры. Здаецца, ён універсальны.

Вось дзэнская прытча аб прастаце.

Вучань пытаецца ў Чжаачжоу:

— Настаўнік, я яшчэ навічок, пакажые мне ШЛЯХ.

— Ты ўжо снедаў?

— Так.

— Дык ідзі і памый міску.

Супастаўце з «Даа дэцзінам»: «Той, хто ведае, не гаворыць, той, хто гаворыць, не ведае...» Атрымаўся намёк на Ісціну.

Дзэн можна разглядаць і як спосаб жыцця ўсходняга чалавека, які імкнецца спасцігнуць тое, што мовай кадзіруецца як «ісціна». Пра дзэн як філасофскую сістэму — крыху пасля. А зараз вашай увазе прапаноўваюцца ДЗЭНСКІЯ ГІСТОРЫІ. Дзэн не трывае сістэмы, ён сцвярджае плынь і недасказанасць жыцця. Таму дзэн-будызм выкладаецца ў прытчах, дзе намёкам перадаецца шырыня неабдымнага.

Што ж такое дзэн?

— Вы вісіце над прорвай, учапіўшыся зубамі за куст, у гэты час вас пытаюць: «У чым ісціна дзэн?» Што б вы адказалі?

Такое заданне ставіцца перад вучнем у секце дзэн-будызму на працягу доўгага часу, аж пакуль не загоняць шукальніка Ісціны ў вугал. І там, як бы перад сапраўднай прорвай, скурай адчуваючы безвыхаднасць каана (задання), ён, нарэшце, зрываецца, ляціць — і ў самае жудаснае імгненне спасцігае.

Маленькая рыбка сказала марской каралеве: «Я ўвесь час чую пра мора, але што такое мора, дзе яно — я не ведаю». Марская каралева адказала: «Ты жывеш, рухаешся, знаходзішся ў моры. Мора і па-за табой, і ў табе самой. Ты народжана морам, і мора паглыне цябе пасля смерці. Мора ёсць быццё тваё». Дзэн падобны да мора.

### РАЗМОВА ДВУХ МАНАХАЎ

Адзін манах сказаў, што камень, які ён бачыць, знаходзіцца ў яго мозгу. Другі адказаў яму: «Тваёй галаве прыйдзецца цяжкавата, калі ты збярэш у ёй усе камяні, што ляжаць па ўсёй акрузе».

### ПАРАДА ПРАФЕСАРУ

Нань Ін, дзэнскі настаўнік у час царавання Мэйдзі (1868—1912), прымаў універсітэцкага прафесара. Прафесар хацеў распытаць яго пра сутнасць дзэн. Частуючы яго гарбатай, Нань Ін пераліў цераз край кубка і спакойна працягваў ліць далей. Прафесар не ўтрымаўся і ўсклікнуў: «Яна перапоўнена! Больш не ўвойдзе!»

«Падобна гэтаму кубку, і вы напоўнены вашымі меркаваннямі. Як я магу раскрыць вам дзэн, пакуль вы не апаражніце свой кубак?»

### МЕСЯЦ НЕЛЬГА ПАДАРЫЦЬ

Рокан, дзэнскі старац, жыў простым жыццём у хаціне ля падэшвы гары. Аднойчы вечарам туды зайшоў зладзей і пераканаўся, што брацць няма чаго. Рокан вярнуўся ў хаціну, убачыў зладзея і затрымаў яго. «Вы прайшлі вялікі шлях, каб наведаць мяне,— сказаў ён рабаўніку,— і не павінны пайсці з пустымі рукамі. Калі ласка, вазьміце як падарунак маё адзенне». Прыгаломшаны зладзей узяў адзежу і выслізнуў. Голы Рокан застаўся сядзець, гледзячы на месяц. «Бедны хлапчына,— прамармытаў ён,— шкада, што я не магу падарыць яму гэтую поўню».

### ЧЫТАННЕ СУТР

Селянін запрасіў тэндайскага манаха (гэта адзін з напрамкаў дзэн-будызму ў Японіі) чытаць сутры па яго нябожчыцы жонцы. Калі чытанне скончылася, селянін запытаўся: «Вы думаеце, што маёй жонцы гэта спатрэбіцца?» «Не толькі вашай жонцы. Усё жывое атрымлівае карысць ад чытання сутр», — адказаў манах. «Калі гэта дастанецца ўсім жывым істотам,— сказаў селянін,— то колькі выпадзе маёй жонцы? Яна вельмі слабая, і іншыя захопяць тое, што прызначана ёй. Калі ласка, прачытайце сутры для яе адной».

Манах растлумачыў, што будыст павінен жадаць дабра ўсім жывым істотам. «Вельмі ўзвышанае вучэнне,— згадзіўся селянін,— вельмі, але, калі ласка, зрабіце адно выключэнне. Мой сусед увесь час псуе мне жыццё. Выключыце яго як-небудзь з ліку ўсіх жывых істот».

### РАМАНТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ НА БРУДНАЙ ДАРОЗЕ

Танзан і Экідо ішлі неяк разам па бруднай дарозе. Ішоў моцны дождж. Мінуўшы паварот, яны ўбачылі прыгожую дзяўчыну ў шаўковым кімано і шалі. Яна бездапаможна прыпынілася на раскрыжаванні. «Жывей, дзяўчына!» — сказаў Танзан, узяў яе на рукі і перанёс праз лужыну. Экідо маўчаў, пакуль яны не спыніліся на начлег. Нарэшце ён не вытрымаў: «Мы, манахі, не павінны падыходзіць да жанчын, асабліва да маладых і прыгожых. Гэта небяспечна. Нашто Вы гэта зрабілі?» «Я пакінуў дзяўчыну там,— адказаў Танзан.— А Вы ўсё яшчэ цягнеце яе на сабе?»

СТУДЫЁН

## СПОРТ І ПАЛІТЫКА

# НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ СКАЖА: «ТРЭБА». «ЁСЦЬ!»— АДКАЖА ФУТБАЛІСТ

*Усе мы бачым, як вялікі спорт магутнай дзяржавы драбніцца сёння па асобных рэгіёнах, пасля чаго і вялікім яго можна назваць не без перабольшвання. І што яшчэ мацней засмучае — менш за ўсё павінны ў гэтым спартсмены, іх трэнеры і нават функцыянеры ад спорту. Але — што зробіш, калі палітычныя хвалі, адна за адной, не маглі не захлынуць і гэтую сферу нашага жыцця. Палітыка, яна і ў спорце палітыка.*

Яшчэ не так даўно на Беларусі ідэя нацыянальнага футбольнага чэмпіяната нават не вітала ў паветры. Людзі, якія нейкім чынам мелі дачыненне да гэтага віду спорту, не ўспрымалі яе ўсур'ёз: як гэта флагман беларускага футбола мінскае «Дынама» можа гуляць у адным першынстве з нейкай аматарскай правінцыяльнай камандай?

Так, за працяглы перыяд Беларусь здолела стварыць толькі адну сапраўды прафесійную каманду, якая мае больш-менш добрыя фінансавыя магчымасці і неблагую трэніровачную базу. І гэта толькі ў параўнанні з іншымі беларускімі клубамі. Бо, як заўважыў А. Барысевіч («Пресс-бол», № 48 за 1991 г.), «мінскае «Дынама» заўсёды быў жабрацкім правінцыяльным клубам — як гэта ні горка, ні крыўдна, ні сорамна прызнаць».

Ёсць падставы сцвярджаць, што з такой футбольнай спадчынай эпохі сацыялізму спроба перайсці на незалежны нацыянальны чэмпіянат выглядае ні больш, ні менш як самагубства. Нават пасля абвяшчэння Дэкларацыі аб нацыянальным суверэнітэце.

І ўсё ж, мы пайшлі гэтым шляхам. Чаму? Не трэба рабіць глыбокага аналізу, каб заўважыць, што са спартыўнага боку (а менавіта ён павінен быць галоўным) гэта, відавочна, крок назад. Відаць, у футбол пачалі ўмешвацца незямныя сілы... Пэўна, лічыць імі палітыку і эканоміку, якія сталі сёння асновай нашага жыцця, нельга.

Дык што ж з'явілася штуршком да рэфармавання беларускага і ўсяго савецкага футбола? Прывяду невялікую вытрымку з артыкула пад назвай «99 працэнтаў за тое, што ў нас будзе свая беларуская зона» («Физкультурник Белоруссии», № 166—167 за 1991 г.): «Беларускі футбол гатовы да таго, каб выйсці на новыя рубяжы. У нас ёсць добры рэзерв у выглядзе дзесяткаў каманд... Так што футбол ад новаўводзін толькі выйграе і маральна, і матэрыяльна». Гэтыя словы належаць старшыні Федэрацыі футбола Беларусі Яўгену Шунтову, сказаны яны былі ў канцы жніўня мінулага года.

Але ж, як лічаць спецыялісты, падобную рэфармацыю футбола трэба было правесці гадоў дзесяць таму. Пакуль само жыццё не прымусіла, гэта пытанне нікога не хвалявала.

Аднак ідэя рэфармавання беларускага футбола ў межах усесаюзнага праіснавала нядоўга. Не прайшло і месяца, як той жа Шунтоў заявіў: «Так што трэба брацца за арганізацыю чыста беларускай футбольнай гаспадаркі» («Физкультурник Белоруссии», № 176—177). Толькі не трэба лічыць старшыню беларускай футбольнай Федэрацыі заўзятым прыхільнікам незалежнасці Бацькаўшчыны. На такі крок нас прымусілі пайсці тыя падзеі, што адбываліся ў нашых суседзяў. Так, Украіна канчаткова вызначылася наконт правядзення нацыянальнага чэмпіяната, да такога ж рашэння ішла і Расія.

Пацверджаннем гэтай думкі могуць быць словы галоўнага трэнера мінскага «Дынама» Міхаіла Вергяенкі:



«Падзеі ў краіне развіваюцца імкліва... Трэба думаць, пралічваць, валодаць інфармацыяй. А мы пакуль варажым: так будуць праводзіць ці гэдак. Тэрмінова трэба выходзіць на ФІФА, падаваць усе неабходныя дакументы. Тэрмінова! Калі прызнаюць і дазволяць выхад на Еўропу з восені, тады трэба праводзіць наш чэмпіянат» («Пресс-бол», № 49).

А пра ўзаемаадносіны футбола і палітыкі галоўны трэнер выказаўся так: «Усё падпарадкавана палітыцы. Цяжка дапусціць, каб існавалі самастойна рэспублікі-дзяржавы, а футбол быў агульны. Таму што футбол, як ні парадаксальна,— гэта эканоміка» («Физкультурник Белоруссии», № 176—177).

Па ўсяму відаць, што такія меркаванні былі і ў іншых футбольных спецыялістаў рэспублікі. Жыццё прымусіла іх быць празорлівымі людзьмі, г. зн. ведаць сёння, што адбудзецца заўтра. І яны прадбачылі бесперспектыўнасць надзеі захаваць агульны футбол, футбол былога СССР. У такой сітуацыі выбару далейшага шляху ўжо няма: альбо нацыянальны чэмпіянат, або невядомасць.

Галоўны трэнер магілёўскага «Дняпра» Валерый Стральцоў выказаў па гэтаму пытанню думку, якой прытрымліваюцца ўсе яго калегі: «...Ну што, будзем чакаць, як зробіць Украіна, Расія, а потым варажыць: возьмуць яны нас да сябе ці не возьмуць... Вы пытаецеся, ці хоча «Днепр» гуляць у першай лізе СССР? Мы хочам выступаць у чэмпіянаце Беларусі!» («Пресс-бол», № 49).

А вось беларускія аматары футбол прыйшлі да кансенсусу не адразу. Будучае любімага віду спорту іх хвалявала не менш, чым спецыялістаў. Спрэчкі - меркаванні з'явіліся на старонках газет. Масла ў вогнішча падліў Ю. Алексін з Гродна. У сваім лісце ў «Физкультурник Белоруссии» ён паспрабаваў знайсці выхад з сітуацыі, калі рэспубліка не можа застаўацца ў першынстве краіны, якая развальваецца, але і нацыянальны чэмпіянат — не лепшы выхад з тупіка. На яго думку, трэба адкінуць нацыянальныя амбіцыі, аб'яднацца з Балтыяй і праводзіць сумеснае першынство па футболу.

Публікацыя гэтага ліста выклікала шырокі рэзананс, і рэдакцыя «Физкультурника Белоруссии» неаднаразова (№№ 190, 227—228, 235) змяшчала водгукі беларускіх балельшчыкаў, часам супрацьлеглыя.

Напрыклад, Ю. Шмялёў з Барысава, В. Саковіч і шэраг іншых аматараў футбола лічаць, што правядзенне нацыянальнага чэмпіяната — адзіны верны шлях выхаду з крызісу. Іншыя бачаць мінскае «Дынама» толькі ў Саюзе (калі б ён яшчэ быў).

...Гавораць, што ісціна нараджаецца ў спрэчках. Наш выпадак з'яўляецца выключэннем. Ніякія дыскусіі ці рэферэндумы не здолелі б істотна паўплываць на гэты працэс. Як быў наканаваны распад СССР, такі ўдзел чакаў і футбол адной з магутнейшых краін свету. Вялікі футбол, як і ўвесь спорт, не адстае ад вялікай палітыкі.

Ужо пачаліся чэмпіянаты Украіны і Расіі, хутка стартуе і наш. Таму можна з упэўненасцю сказаць: «Бывай, чэмпіянат СССР! Вітаем цябе, першынство Беларусі!»

А. ЮРЫН.

## АЎТАГОЛ

*Гутараць два шатландцы:*
*— Чулі, наш футбольны клуб пасля васьмігадовага перапынку зноў пачаў трэніравацца.*
*— Няўжо? Яны, што, нарэшце, знайшлі той згублены мяч?*

*Бацька чытае газету, і ў вочы яму кідаецца буйны загаловак артыкула: «З футбалістам заключаны кантракт на паўмільёна рублёў». Ён задумліва глядзіць на сына, які вучыць урокі, уздыхае і раптам гаворыць:*
*— Ну, чаго ты рассеўся з гэтымі дурацкімі задачкамі, пайшоў бы лепш на двор і пайграў у футбол!*

## ПРАЗ РАСЧЫНЕНЫЯ ДЗВЕРЫ

# АЙКІДА: невядомыя старонкі

Усіх нас прыцягвае невядомае. Яшчэ не так даўно мы толькі чулі нязвыклыя словы: кэндо, сэйкіда, кіай-джытсу... Ведалі толькі, што гэта старажытныя віды японскай барацьбы.

Прапануем вам пазнаёміцца з перадгісторыяй барацьбы айкіда. У далейшым плануем прадставіць інфармацыю аб паходжанні і сутнасці іншых усходніх адзінаборстваў.

Гісторыя айкіда складаная і поўная цьмяных плям. Карані гэтага баявога мастацтва ўзыходзяць да далёкага перыяду гісторыі Японіі.

Стваральнікам самай старой школы быў князь Тэйдзюн, шосты сын імператара Сэйва (850—880). Пра гэту школу вядома толькі, што ёй прыпісвалася назва Дайта Айкідзіцу і што ў ёй навучаліся самураі самага высокага рангу.

Вялікія заслугі прыпісваюць самураю Ёсіцуне. Згодна з паданнем, ён быў у храме ў час медытацыі, а калі аднойчы заснуў, то... Працяг падання падобны на іншыя апавяданні такога роду.

Іншыя гістарычныя дадзеныя называюць пераемніка Дайты Айкідзіцу — Ёсіе Мінамута. Ужо смяротна хворы, ён перадаў сваё мастацтва малодшаму брату Сінра Сабура Ёсіміцу. З поспехам займаўся астраноміяй, медыцынай, геалогіяй. Веданне анатоміі чалавека дазволілі яму ўдасканаліць многія прыёмы.

Другі сын Ёсіміцу — Ёсікіё — пераязджае ў правінцыю Кай і хутка, дзякуючы жаніцьбе, уваходзіць у клан Такеда, якому ён часткова перадае таямніцы мастацтва свайго бацькі. З гэтае пары баявое мастацтва развіваецца як у клане Мінамота, так і ў Такеда. У 1574 годзе Кунігуцу Такеда пазнаёміў са сваім мастацтвам клан Айдзу. Праз некаторы час тэхніка прыёмаў пачынае адрозніваццa ад першапачатковага вобразу і існуе, па меншай меры, у трох відах:

1) айдзу-тадаме — прыёмы пераемнікаў Кунігуцу Такеды;
2) дайта-ру — прыёмы пераемнікаў Дайта Айкідзіцу;
3) такеда-ру — прыёмы пераемнікаў Ёсікіё, майстрам якіх быў самурай, філосаф Такеда Такумі но Камісоеман (1758—1853).

Дададзім, што Камісоеман распрацаваў філасофскую дактрыну пад назвай «айкі ін ё хо». Найбольш шырокае распаўсюджанне яна набыла ў клане Айдзу.

З пачаткам перыяду Мэйдзі знікаюць многія традыцыі. Найбольшыя заслугі ў захаванні гэтых прыёмаў на працягу бурнага перыяду мадэрнізму належаць паганскаму святару Сайга Танома Цікамасе (1829—1905). У перыяд Мэйдзі ён меў сур'ёзныя канфлікты з паліцыяй, таму афіцыйнае заснаванне школы было немагчымым. У гэтай сітуацыі Танома шукае адданага і здольнага хлопца, які змог бы стаць нашчадкам «скарбніцы», якая развівалася і захоўвалася на працягу многіх стагоддзяў.

Характэрнай асобай з'явіўся таленавіты Сайга Сіра, які меў дачыненне да вокамгненнай перамогі Кадакана над Ёсін-ру. Ён вывучаў адначасова прыёмы асікіусі і тэндзінсіна-ру, а пазней і дзюдо, у Дзігора Кано. Але хутка ўзнікае востры канфлікт паміж асікіусі і дзюдо, канфлікт складаны, які меў відавочна эканамічную падаплёку. Час быў цяжкі, і кожная школа імкнулася набыць дазвол на навучанне, што на той перыяд забяспечвала бязбедным існаваннем. Не выпадкова барацьба паміж школамі робіцца ўсё больш вострай. Сайга Сіра не жадае аддаць перавагу нікому. Ён пакідае Токіо і прысвячае сябе кюдо (стральба з лука). А Танома энергічна пачынае шукаць наступнага кандыдата, каб даверыць яму тайны асікіусі.

Ім з'явіўся Сакаку Такеда, вядомы фехтавальшчык. Хутка майстар і новы вучань становяцца сябрамі. Гэтаму спрыяла тое, што яны абодва мелі аднолькавыя палітычныя погляды.

У той час, калі насіць меч забаранялася, Такеда любіў прагульвацца «пры зброі» па вуліцах Токіо, дэманструючы сваю адданасць традыцыям. Аднак Сайга Танома лічыць, што эпоха мяча прайшла. Таму ён спрабуе пераканаць Сакаку Такеда пакінуць меч і аддаць перавагу барацьбе без зброі. У рэшце рэшт, перакананы Такеда вырашае паехаць на Хакайда, каб пачаць там новае жыццё. Палітычнае становішча мяняецца, і ён паступова прадпрымае спробы адкрыць уласнае дадзё (памяшканне для трэніровак). Гэтай мэты дасягае толькі яго сын Такімуне Такеда.

Ёсць сэнс сказаць і аб настаўніку Марыхэе Уэсіба (1883—1969). Прыкладна ў 1901 годзе маладога Уэсіба інструкціруе па кіта-ру Тадзава Токасабура. Але з-за вельмі ранніх інтэнсіўных трэніроак, якія аказалі ўплыў на яго здароўе, ён робіць перапынак на два гады. Пазней вучыцца барацьбе ў Накаэ Масакацу — цікавага настаўніка, які, будучы адначасова інструктарам па фехтаванню, пераконвае Уэсібу, што тэхніка прыёмаў мяча мае яўную сувязь з рукапашнай барацьбой.

У 1910 годзе Уэсіба едзе на Хакайда, дзе праз пяць гадоў выпадак зводзіць яго з Санака Такеда. Дайта-ру ў выкананні Такеда вельмі ўражвае Уэсібу. І ён вырашае стварыць новую тэхніку прыёмаў, канчатковую форму якіх звязвае з філасофскай дактрынай Ванісабуры Дагуці. Яна прапагандуе мір, любоў да бліжняга і дабро для кожнага.

Ежы МІЛКОЎСКІ.

## СПРЫНТ

### Над МАКам хутка будзе бел-чырвона-белы сцяг

9 сакавіка 1992 года застанецца як адметны ў гісторыі Беларусі. Гэтым днём у Лазане Х. А. Самаранчам быў падпісаны дакумент, згодна з якім Нацыянальны Алімпійскі Камітэт Беларусі стаў членам Міжнароднага Алімпійскага Камітэта. Праўда, членства гэта пакуль часовае і ўмоўнае. Прэзідэнт НАК РБ Уладзімір Рыжанкоў дае такое тлумачэнне гэтаму:

— Членства часовае ў тым сэнсе, што дзейнічаць яно будзе да летніх Алімпійскіх гульняў у Барселоне. Умоўнае — бо ў Іспаніі ўсе рэспублікі былога Саюза павінны выступіць аб'яднанай камандай. Менавіта такую ўмову паставіў Прэзідэнт МАК Самаранч.

Але, нягледзячы на гэта Беларусь, нарэшце, увайшла ў алімпійскую сям'ю, і зусім хутка над будынкам МАКа з'явіцца і наш, бел-чырвона-белы сцяг!

### Ёсць поўны камплект!

У Растове-на-Доне прайшоў, відаць, першы і апошні чэмпіянат СНД па грэка-рымскай барацьбе. У вагавай катэгорыі 100 кг першынстваваў студэнт БДУ Сяргей Дземяшкевіч. А сярод барцоў вагавай катэгорыі да 68 кг лепшым быў добра нам знаёмы Камандар Маджыдаў. Цікава, што да гэтых стартаў Камандар меў перамогі на спаборніцтвах усіх рангаў (чэмпіянаты Еўропы і свету, Алімпійскія гульні), акрамя саюзных. Вось і гэты прабел запоўнены.

Віншуем вас, Камандар і Сяргей!

### З'явіліся і перамогі

Адбыліся першыя спаборніцтвы у рамках Спартакіяды ВНУ Беларусі 1992 года. На зімовых лёгкаатлетычных стартах мацнейшымі былі студэнты ІФК. Нашы спартсмены сталі бронзавымі прызёрамі, прапусціўшы на другое месца прадстаўнікоў Гомельскага універсітэта. Студэнты БДУ трэція таксама і ў класічнай барацьбе (тут першынство зноў за «фізкультурнікамі»). Лепш выступілі нашы лыжнікі. Прапусціўшы ўперад толькі ІФК, яны сталі другімі. А вось нашым майстрам армрэслінга роўных не было. У выніку — першае месца! Спаборніцтвы працягваюцца.

### Падышлі да экватара

Спартакіяда БДУ наблізілася да сваёй сярэдзіны. Апошнім часам прайшлі спаборніцтвы па валейболу і армрэслінгу. Сярод юнакоў-валейбалістаў тройка лепшых выглядае наступным чынам: механіка-матэматычны факультэт, РФЭ, гістарычны. Сярод дзяўчат: факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, біялагічны і філалагічны факультэты. Лепшыя па армрэслінгу — радыёфізікі. Геаграфічны і філасофска-эканамічны факультэты былі тут адпаведна другімі і трэцімі. Спартсмены падышлі да экватара, і самыя гарачыя дні ў іх яшчэ наперадзе.

Калектыў выкладчыкаў і студэнтаў факультэта журналістыкі выказвае спачуванне студэнту з Лівана ЗІАДУ МАНСУРУ з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці сына.

БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

9 красавіка

Зак. 2186.

Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ.